# Эсэ “Па-над сінім Сожам”

На Беларусі шмат куточкаў
Так блізкіх сэрцу, дзіўна мілых.
Красуюць назвы, бы вяночкі,
Але маленькая Радзіма
Жыве ў душы, як пацалунак
Пяшчотны, трапяткі, ласкавы.
Яна – у адчаі паратунак,
Прытулак у радасці яскравы.

*Людміла Цітко “Малая радзіма”*

Радзіма – якое маленькае слова, а які вялікі і разнастайны сэнс укладзены ў яго! Радзіма – гэта краіна, у якой жывеш, гэта і родны горад, і вуліца, і бацькоўскі дом, а таксама блізкія людзі. Усе гэта мае вялікае значэнне ў жыцці кожнага чалавека і займае асобае месца ў яго сэрцы.

Мне здаецца, што кожны чалавек з’яўляецца патрыетам сваей краіны. Але ў кожнага есць свая “маленькая” Радзіма. Гэта тое месца, дзе ен правеў свае першыя гады жыцця, вымавіў свае першыя словы, зрабіў першыя крокі. Гэта тое месца, куды хочацца заўседы вярнуцца, дзе асабліва востра адчуваецца повязь часоў, кроўнае адзінства з продкамі. Гэта тое месца, дзе твая душа знаходзіць суцяшэнне. У самыя складаныя часіны жыцця памяць аб бацькоўскім доме саграває і аберагае, дапамагае пераадолець цяжкасці. У родных мясцінах і дыхаецца лягчэй, і неба выглядае больш сінім, і сонца свеціць ярчэй і саграває лепш. А самае галоўнае, - людзі раднейшыя.

Там, дзе Сож серабрыцца іскрысты,
Дзе жар-птушкай гарацць купалы,
Горад мой, дарагі мне і блізкі,
Зноў былінна глядзіць з даўніны.

Т. Мельчанка.

З высокага берагу паўнаводнага Сожа глядзіцца ў блакітную рачную далеч старажытны славянскі горад.  Гісторыкі не ведаюць дакладнай даты, калі на высокім беразе Сожа ўзнікла паселішча, якому ў далейшым суджана было стаць буйным індустрыяльным, эканамічным і навуковым цэнтрам. Вядома толькі – сучасны горад размешчаны на зямлі, дзе шмат стагоддзяў таму жылі мужныя і свабодалюбівыя людзі – усходнеславянскае племя радзімічаў (пры ўпадзенні ракі Гомій у Сож).

А сваю гісторыю Гомель, як паўнацэнны горад, вядзе з XII стагоддзя.

У Іпацьеўскім спісе Кіеўскага летапісу ў запісу 1142 года гаворыцца пра захоп смаленскім князем Расціславам горада, які належаў у той час чарнігаўскаму князю Ігару Ольгавічу. Гэты год лічыцца афіцыйнай датай нараджэння Гомеля.

Нібы з даўніны адгукаецца рэхам крык гамеюка:

— Го! Мель! Го! Мель!

Гомель – адзін з прыгажэйшых гарадоў Беларусі, якому належыць багаты гістрачны, культурны і навуковы патэнцыял, які мае свой непаўторны воблік і стыль. Гэта другі па велічыні абласны цэнтр у рэспубліцы з развітай прамысловасцю, навукай, культурай, галоўны транспартны вузел і палітычны цэнтр міжрэгіянальных сувязей Расіі, Украіны і Беларусі. Яго геаграфічнае становішча з’яўляецца перспектыўным як для развіцця айчыннага, так і замежнага бізнесу. Гомель з’яўляцца адным з інтэлектуальных цэнтраў рэспублікі, месцам правядзення культурных і спартыўных мерапрыемстваў. Ен адкрыты для ўсіх форм супрацоўніцтва і заўседы застаецца верным традыцыям гасціннасці.

Візітнай карткай Гомеля з’яўляецца “Гомельскі палацава-паркавы ансамбль” – адзін з самых старэйшых у Рэспубліцы Беларусь. Гэты непаўторны па сваім характве прыродна-архітэктурны ансамбль стаў у нашы дні адным з самых любімых месцаў адпачынку гамяльчан і гасцей горада.

Але Гомельшчына – гэта яшчэ і маці, якая дала вядомых літаратурных іменаў. На Палессі ў в. Глінішчы нарадзіўся народны пісьменнік Беларусі

І.П.Мележ, зрабіў значны ўклад у развіцце беларускай драматургіі народны пісьменнік Беларусі А.Макаенак (наразіўся ў Рагачоўскім раене). У в. Карма Добрушскага раена нарадзіўся народны пісьменнік І.Шамякін.

Мой горад – гэта горад ажурных каштанаў, цяністых алей, шырокіх праспектаў, старажытных і сучасных будынкаў і незвычайных людзей, якія па кроплі стваралі яго гісторыю. А якая прыгожая рака! Яна вабіць, цягне да сябе зноў і зноў. Кожнае лета выбіраеш часіну і спяшаешся на запаветныя берагі. З замілаваннем пазіраеш на рыбакоў, якія стаяцца пад навіслай над вадою зяленай купінай, пазіраеш на зіхоткую, пругкую і зменлівую плынь.

Мне пашчасціла нарадзіцца ў гэтым горадзе, на гэтай чароўнай зямлі! Я, напрыклад, магу гадзінамі ўглядацца ў блакіт неба, акунацца ў калыханне святла пад аграмадамі летняга лісця, прыслухоўвацца да ўрачыстага сцішанага канцэрту восеньскага дажджу. І сапраўды, незвычайная прыродная прыгажосць роднага Гомеля вабіць, трывожыць душу і сэрца.

Сучасныя мікрараены, вырабы народных майстроў і прадукцыя буйных прамысловых прадпрыемстваў, памяць аб загінуўшых і імкненне зрабіць лепшым заўтрашні дзень, карункавы пешаходны мост і высокая вежа з гадзіннікамі-курантамі, што адлічваюць хвіліны, гады, стагоддзі... Такі сёння Гомель, горад, паўсталы з руін вайсковага ліхалецця, які перанёс страшную чарнобыльскую катастрофу, цэнтр адной з абласцей Беларусі.